Смолік А.І., прарэктар
па навучальнай рабоце

# ГУМАНІТАРНЫ АСПЕКТ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ ВЫПУСКНІКА УНІВЕРСІТЭТА

Важнейшая задача, якая паўстала сёння перад універсітэтам, - гэта ўдасканаленне зместу, структуры і арганізацыі падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Таму зараз праводзіцца значная рэарганізацыя сістэмы універсітэцкай адукацыі, вядуцца пошукі эфектыўных формаў і метадаў арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Стварэнне новых кафедраў і ўвядзенне новых спецыяльнасцей і спецыялізацый дазваляюць нам пачаць выкладанне агульнапрынятых ў свеце сацыяльна-эканамічных і гуманітарных дысцыплін і перайсці да еўрапейскай сістэмы вышэйшай адукацыі.

Значна змянілася структура вышэйшай гуманітарнай падрыхтоўкі. У сучасны момант яна ўключае блок гістарычных і беларусазнаўчых, філасофскіх і сацыяльна-эканамічных, культуралагічных і псіхолага-педагагічных дысцыплін. У новых вучэбных планах на іх вывучэнне адводзіцца 35 працэнтаў часу. Справа за тым, каб напоўніць гэтыя блокі сучасным зместам, эфектыўнымі формамі і метадамі выкладання. Аналіз сведчыць, што шэраг выкладчыкаў агульнауніверсітэцкіх і факультэцкіх кафедраў істотна перагледзелі змест курсаў.

На лекцыях і семінарскіх занятках вялікая ўвага павінна ўдзяляцца праблемам сусветнай і айчыннай культуры, яе гісторыі. Разглядаючы нацыянальную культуру ў кантэксце сусветнай як яе значную плынь, неабходна забяспечыць прыярытэтнасць паглыбленага вывучэння беларускай культуры. Менавіта таму ў сучасныя вучэбныя планы ўключаны такія дысцыпліны, як нацыянальная гісторыя, этнаграфія беларусаў, тэорыя і гісторыя культуры, міфалогія і фальклор, беларуская мастацкая культура і інш.

Значна пашыраны курсы, якія закладваюць у студэнтаў асновы ведаў беларускай народнай культуры. Студэнты факультэтаў мастацкай творчасці паглыблена вывучаюць праблемы развіцця музычнага фальклору, авалодваюць выканальніцкім майстэрствам на самабытных музычных інструментах, робяць расшыфроўкі і аранжыроўкі народных песень.

Вялікія магчымасці інтэнсіфікацыі працэсу гуманітарызацыі закладзены ў сацыяльна-эканамічных дысцыплінах. Выкладчыкі кафедраў філасофіі, сацыялогіі, беларусазнаўства, педагогікі і псіхалогіі маюць магчымасць шырэй паказваць гісторыю развіцця філасофскай і грамадска-палітычнай думкі, асаблівасці фарміравання маральнай культуры народа, развіцця этнапсіхалогіі і гісторыі, педагагічнай думкі.

Пэўным пазітыўным момантам паглыблення гуманітарызацыі навучальнага працэсу з'яўляецца тое, што большасць студэнтаў цяпер пачынаюць рыхтаваць дыпломныя працы. Іх тэматыка павінна быць ненасрэдна звязана з аспектамі развіцця як гісторыі, так і сучаснага стану грамадства, палітыкі, права, свядомасці і культуры еўрапейскіх народаў.

Напісанне бакалаўрскіх і магістэрскіх прац дае шырокую магчымасць для распрацоўкі праблем беларускай культуры, аналізу рэгіянальнай культуры, звычаяў, абрадаў, свят беларусаў.

Галоўнай мэтай гуманітарнай і прафесійнай адукацыі з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў разумення гармоніі свету, таму што разрозненасць, мазаічнасць уяўлення аб існуючай рэальнасці пазбаўляе чалавека ўпэўненасці ў выбары жыццёвых рашэнняў, душэўнай раўнавагі і добразычлівых адносін да людзей.

У працэсе вывучэння сацыялогіі, філасофіі, псіхалогіі, культуралогіі ў будучага спецыяліста павінны сфарміравацца індывідуальны сацыякультурны вопыт, этнічная самасвядомасць.

На лекцыях і семінарскіх занятках па гуманітарных дысцыплінах неабходна грунтоўна займацца аналізам сацыяльных сістэм, вывучаць узаемаадносіны асобы з сацыяльнымі сістэмамі.

Таму асобнае месца сярод сацыякультурных дысцыплін займаюць сацыяльная псіхалогія, якая вывучае індывіда пераважна як члена малых груп, лакальныя, эмпірычныя культуры, жыццёвы ўклад у адносна замкнутых супольнасцях - клубах, арганізацыях, таварыствах і г.д.

У сучасных умовах, калі адбываюцца інфарматызацыя грамадства, укараненне камп'ютэрных тэхналогій, важнае значэнне набывае гуманітарны аспект інфармацыйнай культуры спецыяліста. Яго рэалізацыя можа ажыццяўляцца ў двух накірунках: комплексам інфармацыі гуманітарнага зместу, а таксама спецыяльна распрацаванымі гуманітарнымі асновамі ўсей сістэмы адукацыі. Першы накірунак павінен рэалізоўвацца якраз праз агульнаадукацыйныя, гуманітарныя дысцыпліны. Што тычыцца другога накірунку, то гуманітарныя асновы, па нашаму меркаванню, павінны разглядацца як галоўныя і для ўсей сістэмы дысцыплін, і для кожнага канкрэтнага прадмета (ад мовы да мастацтва).

Такім чынам, шляхі фарміравання асобы гуманітарнага складу - гэта выкладанне і гуманітарных, і спецыяльных навук.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ